| | | |
|---|---|---|
| ERB-SPF-05/99 | Formy ochrony środowiska przyrodniczego | Urząd Miasta w Rumii, ul. Sobieskiego 7 |
| ERB-SPF-06/99 | Międzynarodowy obóz ekologiczny dla młodzieży szkół ponadpodstawowych | Szkoła Edukacji ekologicznej, Piaski, ul. Piaskowa 23 |
| ERB-SPF-10/99 | Dni Biznesu Małych i Średnich Przedsiębiorstw z Miast Zaprzyjaźnionych z Elblągiem | Urząd Miasta w Elblągu, ul. Łączności 1 |
| ERB-SPF-11/99 | Spotkanie kulturalne nadbałtyckich miast zaprzyjaźnionych z Elblągiem | Urząd Miasta w Elblągu, ul. Łączności 1 |
| ERB-SPF-12/99 | Galowy Koncert – Podsumowanie Przeglądu Zespołów Muzycznych i | Urząd Miasta w Elblągu, ul. Łączności 1 |
| ERB-SPF-13/99 | „Poznajmy się" Promocja Gmin Partnerskich | Urząd Miasta w Olsztynku, ul. Ratusz 1 |
| ERB-SPF- | Prezentacja Miasta i Regionu Liepai | Urząd miasta w Gdyni |
| ERB-SPF-18/99 | Integracje '99 | Ośr. Kultury, Sportu i Rekreacji Miasta i Gminy Młynary, ul. Dworcowa 10 |
| ERB-SPF-21/99 | Opieka paliatywna (Hospicjum) | Hospicjum św. Jerzego Elbląg, ul. Kopernika 26/28 |
| ERB-SPF-24/99 | Aktywizacja młodzieży bezrobotnej poprzez integrację z grupą osób... | Fundacja Pomocy Społecznej „Samopomoc", Górowo |
| ERB-SPF-25/99 | Rowerem po trasach nadbałtyckich | Związek Gmin „Jeziorak" Ul. Niepodległości 13 14-200 |
| ERB-SPF-26/99 | Warsztaty plastyczne „Podróże ze szkicownikiem" | Miasto i Gmina Prabuty, ul. Kwidzyńska |
| ERB-SPF-29/99 | Współpraca wysp bałtyckich – zielona turystyka, budowa ścieżek rowerowych | Urząd Miasta w Gdańsku ul. Nowe Ogrody 8/12 |
| ERB-SPF-31/99 | V Jubileuszowy Turniej Szachowy | Młodzieżowe Centrum Kultury, Słupsk |

Źródło: Urząd Wojewódzki, Akta Euroregionu Bałtyk

W większości wniosków realizowanych w 1999 r. udziału nie biorą Łotwa i Dania. Pozostali uczestnicy euroregionu wraz z obwodem Kaliningradzkim aktywnie uczestniczą w realizowanych programach licząc na ich rozszerzenie w kolejnych latach.

## КАНЦЭПЦЫЯ СТВАРЭННЯ СІСТЭМЫ КІРАВАННЯ НАВАКОЛЬНЫМ АСЯРОДДЗЕМ (КНА) ПРЫБУЖЖА

*А.І. Рубахаў, С.С. Валасюк*

*Брэсцкі політэхнічны інстытут, Рэспубліка Беларусь*

Пры распрацоўцы канцэпцыі аўтары зыходзяць з таго, што ў сучаснай еўрапейскай прававой дзяржаве, клопат аб устойлівым развіцці і захаванні прырод-

най спадчыны з'яўляецца перадусім абавязкам грамадзянскай супольнасці. Дзяржаўныя гарантыі спрыяльнага асяроддзя, дзяржаўная экалагічная палітыка і інфраструктура КНА з'яўляюцца вельмі істотным інструментам у яе руках. Інструментам, аднак, малапрыдатным, калі намаганні дзяржавы ў галіне рацыянальнага і праэкалагічнага КНА не падмацоўваюцца высілкамі ўсіх сектараў грамадства.

Сённяшняя еўрапейская мадэль дзяржаўнага будаўніцтва характарызуецца вялікай роляй рэгіёнаў у прыватнасці ў вырашэнні экалагічных праблем і іншых праблем лакальнай супольнасці. Таму прынцыпам пабудовы сістэмы КНАПрыбужжа павінна быць экалагічна і эканамічна абгрунтаваная дэцэнтралізацыя, сэнс якой у пераразмеркаванні правоў і паўнамоцтваў па КНА на карысць кампетэнтных органаў на месцах у памерах неабходных і дастатковых для дасягнення ўстойлівага развіцця на рэгіянальным узроўні. У адносінах да Прыбужжа, падыход біярэгіяналізму ні ў якім разе не супярэчыць канстытуцыйна дэклараванай унітарнасці Беларускай дзяржавы і непарушнасці яе межаў.

Сістэма КНА Прыбужжа не з'яўляецца альтэрнатывай існуючай дзяржаўнай сістэме кіравання прыродакарыстаннем і аховай навакольнага асяроддзя Яна робіць стаўку на мабілізацыю ўсіх патэнцыйных рэсурсаў розных сектароў грамадства на ажыццяўленне агульнай мэты.

Той факт, што пад Прыбужжам маецца на ўвазе не ўся тэрыторыя вобласці, а толькі пэўная яе частка, абцяжарвае задачу. З іншага боку, засцярогі, што гэткі падыход выкліча непрыняцце насельніцтва іншых, непрыбужскіх раёнаў вобласці, бачацца аўтарам беспадстаўнымі, бо 1) геаграфічнае вызначэнне межаў Прыбужжа чыста ўмоўнае, 2) прыродныя працэсы не ведаюць межаў і дзейнасць сістэмы КНА Прыбужжа непазбежна прынясе карысць экасістэмам паўночных і ўсходніх раёнаў, 3) ініцыятыва павінна спарадзіць здаровую канкурэнцыю і даць прыклад да дзеяння, а не глебу для зайздрасці.

На думку аўтараў, Прыбужжа можа стаць прыдатнай пляцоўкай для апрабацыі на Беларускай глебе найноўшых здабыткаў сусветнага вопыту ў галіне КНА, пашырэння міжнароднага супрацоўніцтва і дасягнення паказчыкаў устойлівага развіцця. Роля міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне КНА ўзрастае адпаведна павелічэнню ступені глабалізацыі гаспадарчых працэсаў. Сучасная сістэма КНА павінна зыходзіць з меркавання, што ў адносінах да экалагічных аспектаў палітычныя межы з'яўляюцца ўмоўнымі, а узгодненыя пазіцыі КНА трансгранічных рэгіёнаў пры захаванні тэрытарыяльнай цэласнасці нацыянальных дзяржаваў зніжаюць неабходныя выдаткі грамадскай працы.

Структурныя пераўтварэнні ў краіне адыграюць для сістэмы КНА супярэчлівую ролю. З аднаго боку, пераходнае грамадства мае вельмі абмежаваныя рэсурсы на падтрыманне і ўдасканаленне КНА. З іншага боку, інсталяцыя сучасных рынкавых механізмаў прыродакарыстання дазваляе вырашыць многія праблемы дзеючай сістэмы КНА без буйных капіталаўкладанняў. Сістэма КНА павінна быць гатовая да забеспячэння рацыянальнага прыродакарыстання і здаровага асяроддзя

ва умовах гаспадарчага уздыму.

Галоуным прынцыпамі структурнай пабудовы сістэмы КНА Прыбужжа, на думку аутара павінны быць:

1. *Прынцып рацыянальнай дастатковасці.* Абмежаваныя сродкі павінныя выдаткоувацца у адпаведнасці з вызначаным прыярытэтам і ў рацыянальна абгрунтаваных памерах.
2. *Прынцып планавасці.* У ідэале павінна дапускацца толькі такое умяшальніцтва ў прыроду, аптымальнасць якога забяспечаная навуковым стратэгічным разлікам.
3. *Прынцып субсідыярнасці.* Сістэма КНА Прыбужжа павінна імкнуцца да самастойнага фінансавага забеспячэння сваёй дзейнасці.
4. *Прынцып галоснасці і празрыстасці дзеянняў* павінен забяспечыць станоўчае успрыманне сістэмы КНА грамадскасцю і прадухіліць магчымыя злоўжыванні.
5. *Прынцып прэвентыўнасці.* Прадухіленне негатыўных уздзеянняў на асяроддзе мае у КНА больш высокі прыярытэт, чым іх ліквідацыя.
6. *Прынцып альтэрнатыўнасці.* Працэс ухвалы павінен грунтавацца на магчымасці выбару сярод некалькіх альтэрнатываў. Прэферуюцца бяспройгрышныя варыянты. Непазбежнае прымяненне конкурсных механізмаў.
7. *Прынцып дапасаванасці да існуючых рэаліяў.* Здаючы справу з неідэальнага характару дзеючага беларускага прыродаахоўчага заканадаўства, сістэма прызнае яго прымат і праектуецца такім чынам, каб ажыццяўляць максімальна эфектыўнае КНА ва ўмовах дзеючага заканадаўства, выкарыстоўваючы свае магчымасці па ягонай аптымізацыі.
8. *Прынцып эластычнасці.* Адначасова, сістэма мусіць пільна і адэкватна рэагаваць на змены ў прававым і інстытуцыйным палях, у якіх яна дзейнічае.

Рэгіянальны ўзровень дзейнасці, закладзены у канцэпцыю сістэмы КНА Прыбужжа, абумоўлівае яе структуру. Ідэя неабходнасці развіцця рэгіянальных экалагічных ініцыятываў і прыцягнення лакальных супольнасцяў да вырашэння праблемаў, дэкларававая прынцыпамі ўстойлівага развіцця і адлюстраваная ў Канцэпцыі нацыянальнай стратэгіі устойлівага развіцця не знайшла яшчэ у РБ адпаведнага прымянення і, болей, шмат у чым супярэчыць сённяшняй цэнтралізаванай мадэлі дзяржаўнага ладу. Ідэя Прыбужжа, як біярэгіёну, вымагае афіцыйнай легітымізацыі, як падставы для супрацоўніцтва паміж рознымі сектарамі грамадства і інтэграцыі ўсіх праэкалагічных інстытуцыяў у дзеяздольную сістэму КНА. Таму, у залежнасці ад наяўнасці палітычнай волі да рэгіяналізацыі экалагічнай палітыкі мэтазгодна разгледзець два сцэнары структурнай пабудовы КНА Прыбужжа — адпаведна аптымістычны і песімістычны.

1) Сэнс *аптымістычнага* сцэнару палягае ў заключэнні пагаднення з удзелам абласных і рэспубліканскіх уладаў аб стварэнні біярэгіёну Беларускае Прыбужжа для каардынацыі намаганняў па рацыянальным КНА, судзеяння дасяг-

ненню ўстойлівага развіцця. Для агульнай каардынацыі дзейнасці ствараецца Каардынацыйная Рада (КР) з удзелам прадстаўнікоў мясцовай улады , дзяржаўных органаў КНА адпаведнага ўзроўню, навукоўцаў, прадстаўнікоў палітычных партый, бізнэсу і грамадскіх арганізацый, знаных дзеячоў культуры. КР павінна:

- фармавацца на парытэтнай аснове, на грамадскіх пачатках;
- рэгулярна праводзіць адкрытыя паседжанні;
- знаходзіцца пад патранажам абласных прадстаўнічых уладаў;
- валодаць правам рэгіянальнай нарматворчай ініцыятывы;
- ажыццяўляць свае паўнамоцтвы на аснове поўнага ўзаемнага даверу;
- абіраць кіраўніцтва раз на год з прадстаўнікоў раёнаў па чарзе;
- абмяркоўваць стратэгічныя накірункі развіцця рэгіёну;
- выконваць функцыі надзорчай рады пры выканаўчых органах біярэгіёну.

Адначасова ўхваляецца рашэнне аб стварэнні выканаўчага органу біярэгіёну, умоўна “Агенцтва ўстойлівага развіцця Прыбужжа”. “Агенцтва...” павінна:

- мець афіцыйны статус, валодаць усімі правамі і абавязкамі юрыдычнай асобы;
- выкарыстоўваць прыбыткі ад дзейнасці толькі на праэкалагічныя мэты;
- дзейнічаць ва ўзаемадзеянні з усімі суб’ектамі КНА і сектарамі грамадства;
- ажыццяўляць дзейнасць па прыцягненні ў рэгіён матэрыяльных, інвестыцыйных, навукова-метадычных, інфармацыйных і іншых рэсурсаў для паляпшэння стану навакольнага асяроддзя і ўстойлівага развіцця Прыбужжа;
- ініцыяваць і каардынаваць работы па экалагічным планаванні для Прыбужжа;
- ажыццяўляць трансгранічнае супрацоўніцтва з аналагічнымі ўстановамі, прамаваць Прыбужжа перад патэнцыйнымі інвестарамі, донарамі і іншымі мэтавымі аўдыторыямі;
- штогод складаць у СМІ справаздачы аб сваёй творчай і фінансавай дзейнасці.

У бягучым годзе ў Польшчы на падобных прынцыпах быў створаны Рэгіянальны Саюз Прыбужскіх Паветаў і Гмін.

2) Песімістычны сцэнар выводзіцца з браку палітычнай волі на рэалізацыю аптымістычнага сцэнару. У гэтым выпадку “Агенцтва...” ствараецца, як незалежная грамадская арганізацыя, якая дзейнічае на тэрыторыі Прыбужскіх раёнаў вобласці. У яе статуце фіксуецца т.зв. “амерыканская” арганізацыйная структура, калі над кіруючымі органамі ствараецца Рада Дырэктараў (РД) з правам “вэта” на ўхвалу рашэнняў. У яе склад заснавальнікамі арганізацыі запрашаюцца на парытэтнай аснове прадстаўнікі тэрытарыяльных органаў улады, органаў Мінпрыроды, навукоўцы-эколагі, аўтарытэтныя палітычныя, грамадскія і культурныя дзеячы. Функцыі РД тоесныя функцыям КР з аптымістычнага сцэнару.

Параўноўваючы абодва варыянты можна адзначыць наступныя акалічнасці:

- Абодва сцэнары не прадугледжваюць за прасктаванымі органамі функцыі нарматворчасці прамога дзеяння і не прэтэндуюць на змену

адміністрацыйнага падзелу. Пералічаныя функцыі характарызуюць Каардынацыйную Раду/Раду Дырэктараў (КР/РД) як своеасаблівыя дарадчыя органы пры мясцовых уладах з некаторымі рысамі лабісцкіх груповак. Гарантыяй супраць злоўжыванняў з іх боку з'яўляюцца 1) аўтарытэтнасць складу, 2) парытэтны прынцып фармавання, 3) перыядычная ратацыя кіраўніцтва, 4) удзел прадстаўнікоў мясцовай і рэспубліканскай улады, 5) абсалютная празрыстасць дзейнасці.

- Кожны са сцэнароў мае свае станоўчыя і адмоўныя бакі. У аптымістычным сцэнары КР здольная здзейсніць больш ўплыў на афіцыйную ўхвалу рашэнняў, у песімістычным сцэнары, РД і Агенцтва... больш незалежныя ад уладных структур.
- У абодвух сцэнарах структура КНА недзеяздольная без шырокай грамадскай падтрымкі.
- У абодвух сцэнарах КНА Прыбужжа з`яўляецца не альтэрнатывай, а партнэрам дзяржаўных органаў КНА ў дасягненні устойлівага развіцця ў рэгіёне.
- На думку аўтара, існаванне сістэмы КНА Прыбужжа, створанага па тым ці іншым сцэнары, прывядзе да нейтралізацыі шкодных эфектаў галіновага прынцыпа прыродакарыстання і істотна ўмацуе пазіцыі органаў Мінпрыроды у рэгіёне.

Літаратура
1. Концепция Национальной стратегии устойчивого развития РБ — Мн.: Белсэнс, 1996 — 48 с.
2. Программа действий по охране окружающей среды для Центральной и Восточной Европы. — OECD and World Bank ISBN 963 8454 23 7, 1995 — 90 с.
3. Руководящие принципы комплексного управления природоохранной деятельностью в странах с экономикой переходного периода — Нью-Йорк: ООН, 1994 — 38.
4. Шимова О.С., Соколовский Н.К. Основы экономики природопользования — Мн.: НКФ "Экоперспектива", 1995 — 128 с.

## ПЕРСПЕКТЫВЫ АСАБЛІВА АХОЎНЫХ ПРЫРОДНЫХ ТЭРЫТОРЫЯЎ (ААПТ) У РЭГІЯНАЛЬНЫМ РАЗВІЦЦІ ПРЫБУЖЖА

*С.С. Валасюк*

*Брэсцкі політэхнічны інстытут, Рэспубліка Беларусь*

Дакладная геаграфічная дэфініцыя *Прыбужжа* адсутнічае — сам тэрмін мала ўжываецца ў навуцы. Тут пад Прыбужжам маецца на ўвазе рэгіён, які уключае прыгранічныя раёны Беларусі, Польшчы і Украіны, якія належаць да басейну Заходняга Бугу. Рэгіён Прыбужжа характарызуецца высокай ступенню захаванасці